4 Донорство органов в Великобритании выросло на 50% // Русская служба BBC [Электронный ресурс], – 2013. – Режим доступа: http://www.bbc.co.uk/russian/rolling_news/2013/04/130411_rn_britain_organs_donors.shtml. – Дата доступа: 17.04.2013.

5 Торговля органами: правда и миф // Финам.инфо [Электронный ресурс], – 2013. – Режим доступа: http://finam.info/news/torgovlya-organami-pravda-i-mif/. – Дата доступа: 17.04.2013.

6 Watson, C. The organised crime of organ trafficking / C. Watson // The Faculty of Law University of the Free State; Department of Criminal and Medical Law; Bloemfontein [Electronic resource], – 2006. – Mode of access: http://etd.uovs.ac.za/ETD-db/theses/available/etd-06142007-072827/unrestricted/WatsonC.pdf. – Date of access: 15.04.2013.

7 Human Tissue Act // Legislation.gov.uk [Electronic resource], – 2013. – Mode of access: http://www.legislation.gov.uk/ukpga/2004/30/section/32. – Date of access: 17.04.2013.

**УДК 398.392.1**

***Н. М. Талкачова***

# МІФАЛАГІЗАВАНЫЯ ВОБРАЗЫ ЖЫВЁЛ У ВЕСНАВОЙ КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВАЙ ПАЭЗІІ

*У артыкуле прааналізаваны асобныя фрагменты, звязаныя з масленічнай і юраўскай абраднасцю, у якіх знайшлі адлюстраванне міфалагізаваныя вобразы жывёл, водгукі татэмістычных вераванняў беларусаў. Вобразы жывёл і звязаныя з імі рытуальныя абрадавыя дзеянні яскрава прадстаўлены ў шматлікіх апісаннях абрадаў і песнях земляробчай і жывёлагадоўчай скіраванасці.*

Веснавы перыяд у беларускім народным календары пачынаўся з першага сакавіка, на Аўдакею, а заканчваўся Русальным тыднем. Абрадавыя дзеянні і песні вясны з'яўляліся адлюстраваннем адноўленага свету і ладу жыцця, імклівага бегу часу.

Еўдакія (Аўдакея), што, згодна з народнымі вераваннямі, «трымае ў руцэ лета», Саракі, якія прыпадаюць на веснавое раўнадзенства, Дабравешчанне, Юр'е з яго чарадзейнай расой, абрадамі першага выгану жывёлы ў поле і абходу нівы, узвышана-ўрачысты Вялікдзень, Сёмуха – этапныя святы вясны, з якімі ў архаічнай свядомасці беларусаў звязаны шматлікія міфалагічныя ўяўленні і багатае вербальнае суправаджэнне

У сістэме традыцыйнай народнай культуры важнае месца займаюць міфалагізаваныя вобразы жывёл, якія выступаюць як своеасаблівыя выявы міфалагічнай карціны свету, а значыць, як адмысловая разнавіднасць міфалагізаваных персанажаў. Гэтыя вобразы знайшлі сваё адлюстраванне ў народным календары.

У масленічным абрадавым комплексе вылучаюцца рытуалы, характэрныя для двух апошніх дзён тыдня. Субота і нядзеля прысвячаліся забавам, а галоўным персанажам выступала Масленіца, якая звычайна «катаецца» на конях, напрыклад:

Наша Масленіца гадавая,
Яна госцейка дарагая.
Яна пешшу к нам не ходзіць –
Усё на коніках раз'язджае,
Штоб конікі былі вараныя,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Штоб слугі былі маладыя [2, с. 106]

Паводле меркаванняў даследчыцы Г. А. Барташэвіч, у гэтыя дні людзі «каталіся на конях, убраных стужкамі і званочкамі пад дугой» [1, с. 16]. Як вядома, «конь сімвалізуе інтэлект, мудрасць, шляхетнасць, святло, дынамічную сілу, хуткасць, шпаркасць думкі, бег часу» [3, с. 73].

У старажытнабеларускай міфалогіі конь – найбольш ушанаваная сакральная жывёла, але мае амбівалентную сімволіку. Па-першае, у народзе лічылася, што «конь валодае здольнасцю прадказваць лёс, і ў першую чаргу смерць свайму гаспадару» [3, с. 74], тады каня хавалі разам з гаспадаром. Па-другое, ушанаванне каня было такім, што нават і ў хрысціянскія часы за ім былі замацаваны спецыяльныя апекуны – святыя заступнікі, сярод якіх лічыліся св. Мікалай Цудатворац, святыя Флор і Лаўр, св. Георгій Пераможац і св. Ілья Прарок. «Конскія святыя» адзначалі ў дзень памяці св. Флора і Лаўра і на вясновы Юр'еў дзень.

У народным календары святы, звязаныя з ушанаваннем жывёл, і блізкія да іх персанажы (святыя, пераапранутыя) азначалі змену каляндарных цыклаў. У прыватнасці, менавіта на Масленіцу было прынята аб’язджаць, прывучваць да воза маладых коней, валоў. «Калі маладая жывёла добра вытрымлівала гэтае аб’язджанне, то лічылася, што яе можна пакідаць у гаспадарцы. Калі ж вол або малады конь пасля такіх выпрабаванняў ступалі стомлена і нехаця то гэта было знакам гаспадару лепш збыць такую жывёліну» [4, с. 23]. Увогуле, святочны тыдзень Масленіцы – гэта тыдзень, калі дарослыя людзі клапаціліся аб будучым ураджаі, моладзь – аб тым, каб пабрацца шлюбам. Самае галоўнае – гэта той тыдзень, калі гаспадары выконваюць дзеянні скіраваныя на засцярогу свойскай жывёлы. Гэты клопат даволі выразна выявіўся ў масленічнай абраднасці, святе, якое даўней было прысвечана богу Вялесу. Невыпадкова Масленіца у некаторых мясцовасцях вядома як свята пад назвай «Валоссе (Аўлас)». Вядома, што «на Валосся рабочая жывёла вызвалялася ад працы, ёй даваўся лепшы корм» [4, с. 25]. Жывёлы займаюць важнае месца ў абрадавых дзеяннях, а іх вобразы знайшлі адлюстраванне ў веснавых песнях розных жанравых разнавіднасцей:

Вол бушуе – весну чуе,
Ой, весну чуе.
Не бушуй, воле, бо пайдзеш у поле,
Ой, бо пайдзеш у поле.
Дзеўка плача – замуж хоча,
Ой, замуж хоча.
Не бушуй, воле, шчэ наарэшся,
Ой, шчэ нарэшся.
Не плач, дзеўка, шчэ нажывешся,
Ой, шчэ нажывешся [2, с. 78].

Цікава тое, што ў прыведзенай песні выкарыстаны мастацкі прыём паралелізму, які дапамагае больш яскрава адлюстраваць матыў заклiку да дзяўчыны не спяшацца ў вырашэнні пытанняў, звязаных са шлюбам. Вобраз вала ў дадзеных радках сімвалізуе надыход вясны, той пары, калі ўсё жывое абуджаецца пасля зімовага спакою.

Паводле народных меркаванняў і сведчанняў даследчыкаў Е. А. Грушко і Ю. М. Мядзведзева, вол сімвалізуе бінарныя апазіцыі: гэта цемра і ноч (дзякуючы яго сувязі з месяцам: рогі ў форме паўмесяца); дабрабыт і ахвярапрынашэнне; ахвяра, цярпенне і цяжкая праца.

Народны святочны каляндар накладваецца не толькі на змены ў прыродзе, але і на паводзіны жывёл у цэлым. Ён у значнай ступені вызначае звязаныя з імі абрадавыя і магічныя дзеянні (першы выган жывёлы, яго засцярога ад драпежнікаў). Адчуваючы магутнае ўздзеянне надыходу вясны на навакольны свет і ўспрымаючы сябе як часціну

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

гэтага свету, чалавек звычайна надаваў вялікае значэнне магічнаму ўздзеянню словам, сімвалічным дзеянням, якія былі звязаны з рознымі веснавымі святамі.

У беларускім народным календары Юр'е (Юрай) – адно з найбольш адметных гадавых свят. Абрадава-песенная традыцыя Юр'я на Беларусі ўключае два семантычна ярка выражаныя комплексы – жывёлагадоўчы і земляробчы. Нас больш цікавіць жывёлагадоўчы. У асноўным абрадавыя дзеянні на Юр'я скіраваны на «замыканне» звярам зубоў, на сытасць. Юр'я – цэнтральны персанаж цыкла. У сваіх песнях нашы продкі заклікалі яго, каб захаваў іх «скацінку».

Юр'я, устань рана,
Юр'я, умыйся бела,
Юр'я, прычашыся,
Юр'я, прыбярыся,
Юр'я, вазьмі ключы,
Юр'я, ідзі ў поле,
Юр'я, адамкні зямлю,
Юр'я, выпусці расу,
Божую красу.
Раса на кароўкі,
Каб былі малочны,
Цяляці няўрочны.
Трава на конікі,
Гігель на свіначкі,
Мурог на авечачкі,
А жвірок на вутачкі і на гусачкі. [2, с. 159]

Дабратворнае ўздзеянне Юр'я ў абрадавай песні жывёлагадоўчай скіраванасці звычайна адбываецца не ў форме заклёну, а адлюстравана ў паверʼях. У некаторых юраўскіх песнях гучыць матыў-заклік выгану свойскай жывёлы ў поле на Юр'еву расу, на божую красу: «Каб былі малочны, цяляці няўрочны» [2, с. 159].

У абрадавай практыцы беларусаў рытуальныя дзеянні ў адносінах да жывёлы былі скіраваны на яе засцярогу ад звышнатуральнага ўздзеяння і драпежнікаў. Сярод іх, паводле сведчанняў інфарматараў, можна вылучыць наступныя: «трайны абыход гаспадаром з запаленай грамнічнай свечкай і яйкамі на талерцы статка, пакланенне яму ў час абрадавага абходу, гаспадыні, якая абкурвала жывёлу святочнымі зёлкамі, а затым націрала персці і крыжавіну буйной жывёліне воскам грамнічнай свечкі. Апошні магічны акт быў у кампетэнцыі пастуха: ён лёгка ўдараў асвячонай на Вербніцу вярбінкай кожную жывёліну асобна, а затым утыкаў гэты абрадавы атрыбут у застрэшак хлява дзеля магічнага ўплыву на вяртанне скаціны цэлай і здаровай» [1, с. 113].

З прааналізаванага матэрыялу вынікае, што жывёла займала важнае месца ў жыцці чалавека. Самым значным на рытуальныя дзеянні з выкарыстаннем жывёлы і надання ёй сакральнага значэння, з'яўляецца юраўскі цыкл земляробчага календара. Вобразы такіх жывёл, як конь і вол, жывёл і звязаныя з імі міфалагічныя ўяўленні, яскрава прадстаўлены ў шматлікіх песнях земляробчай і жывёлагадоўчай скіраванасці.

**Літаратура**

1 Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік / Пад. рэд. С. Санько [і інш.]; склад. І. Клімковіч. – 2-ое выд., дап. – Мінск: Беларусь, 2006. – 599 с.

2 Веснавыя песні / пад. рэд. К. П. Кабашнікава [і інш.]; складальнік муз. часткі В. І. Ялтаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 608 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

3 Грушко, Е. А., Словарь славянской мифологии / под. ред. Ю. М. Медведева. – Нижний Новгород: Русский купец, Братья славяне, 1995. – 368 с.
4 Ліцьвінка, В. Д. Святы і абрады беларусаў – 2-ое выд. / пад. рэд. В. Д. Ліцьвінка. – Мінск : Беларусь, 1998. – 190 с.

**УДК 796.015.12:796.422.12**

***И. И. Трофимович***

## СРЕДСТВА И МЕТОДЫ РАЗВИТИЯ СКОРОСТНЫХ СПОСОБНОСТЕЙ У БЕГУНОВ НА КОРОТКИЕ ДИСТАНЦИИ

*Статья посвящена спринту, где большую роль играют скоростные способности, определяющиеся, прежде всего, такими факторами как наследственность, возраст, пол, состояние нервно-мышечного аппарата (механизм), временем суток и некоторыми др. Определены виды скоростных способностей. Рассмотрены основные средства развития различных форм быстроты и выделены четыре режима – (А, В, Д, Е), каждый из которых характерен особым изменением работоспособности и функциональных изменений в организме спортсмена.*

Бег на короткие дистанции (спринт) является одним из самых зрелищных видов легкой атлетики. Спринт предъявляет высокие требования ко всем сторонам физической подготовленности, особенно к скоростным способностям, которые определяются, прежде всего, такими факторами как наследственность, возраст, пол, состояние нервно-мышечного аппарата (механизм), временем суток и некоторыми др.

Под скоростными способностями понимают возможности человека, обеспечивающие ему выполнение двигательных действий в минимальный для данных условий промежуток времени. Различают следующие виды скоростных способностей:

– быстрота двигательной реакции;
– быстрота одиночного движения;
– частота (темп) движений.

Их принято считать элементарными видами (формами) проявления скоростных способностей. К скоростным способностям относят также быстроту выполнения целостных двигательных действий, способность как можно быстрее набрать максимальную скорость и способность длительно поддерживать ее. Это комплексные виды скоростных способностей.

Наиболее благоприятными периодами для развития скоростных способностей считается возраст от 7 до 11 лет. Несколько в меньше темпе рост различных показателей быстроты продолжается с 11 до 14–15 лет. Но целенаправленные воздействия оказывают положительное влияние на развитие скоростных способностей: специально тренирующиеся имеют преимущество на 5–20 % и более.

Одним из важнейших качеств бегунов на короткие дистанции являются быстрота. В это понятие входит способность человека совершать двигательные действия в минимальный для данных условий отрезок времени.

Основными средствами развития различных форм быстроты являются упражнения, требующие быстрых двигательных реакций, высокой скорости и частоты выполнения движений.

Упражнения необходимо подбирать соответственно тому виду проявления скорости движения, которой необходимо развивать.

В зависимости от того, в какой стадии отдыха повторяется каждое последующие упражнение, в занятии выделяют четыре режима – (А, В, Д, Е), каждый из которых характерен особым изменением работоспособности и функциональных изменений в организме спортсмена.

Режим (А), при котором каждое последующее упражнение выполняется в первой

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ